# Саветы—улада народная

***Інтэрв'ю з кандыдатам у народныя дэпутаты БССР, Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета рэспублікі М. І. ДЗЕМЯНЦЕЕМ***

**— Мікалай Іванавіч, у ходзе перадвыбарнай кампаніі Вам даводзілася сустракацца з многімі працоўнымі калектывамі і проста з выбаршчыкамі. Натуральна, прыходзілася адказваць на пытанні аб эканамічнай і грамадска-палітычнай сітуацыі ў рэспубліцы. Як Вы яе ацэньваеце і якія бачыце шляхі для вырашэння існуючых праблем? Як гэта адлюстравана ў Вашай перадвыбарнай праграме?**

— Ні для кога не сакрэт, што сітуацыя ў рэспубліцы сёння вельмі няпростая. Гадамі ўзнікаўшыя праблемы ў эканоміцы, асабліва ў сацыяльнай сферы, усё больш настойліва даюць аб сабе знаць. Разбалансаваны спажывецкі рынак, незадаволены попыт на тавары перавысіў два мільярды рублёў, вострая жыллёвая праблема — у чарзе на атрыманне жылля стаіць больш як 600 тысяч сем'яў і адзінокіх грамадзян, шмат недахопаў у сістэме аховы здароўя. Пагоршылася экалагічная сітуацыя, узрасла злачыннасць, знізілася дысцыпліна — усё гэта выклікае абгрунтаваную незадаволенасць людзей, якія чакаюць ад перабудовы рэальных змен да лепшага. Сапраўднай трагедыяй для беларускага народа стала аварыя на Чарнобыльскай АЭС.

Прычыны існуючага становішча сёння вядомыя. Гэта і празмерная цэнтралізацыя эканомікі, і непаслядоўнасць пры ажыццяўленні многіх рэформ, і непрадуманасць некаторых рашэнняў і, нарэшце, бездапаможнасць мясцовых органаў улады на падведамных тэрыторыях.

Вось чаму ў аснове маёй перадвыбарнай праграмы — імкненне зрабіць усё, каб праз абноўленыя Саветы забяспечыць кожнаму чалавеку неабходныя ўмовы жыцця і працы, сацыяльную справядлівасць, палітычную свабоду, упэўненасць у заўтрашнім дні. Менавіта Саветам і іх выканаўчым органам належыць галоўная роля ў вырашэнні гэтых задач.

Прававая аснова іх дзейнасці цяпер ствараецца на праходзячай сесіі Вярхоўнага Савета СССР, дзе будуць прыняты законы аб уласнасці, аб зямлі, аб падаткаабкладанні, аб мясцовым самакіраванні і мясцовай гаспадарцы.

Але пры ўсёй сваёй значнасці, гэтыя законы нічога не дадуць, калі не будуць падмацаваны канкрэтнай работай на ўсіх узроўнях: ад урада да працоўных калектываў. Значыць, сёння, напярэдадні выбараў, кожны з нас павінен сур'ёзна задумацца аб сваім месцы ў перабудове, аб сваім укладзе ў яе паскарэнне. Асабліва гэта датычыць кандыдатаў у народныя дэпутаты — тых, каму трэба будзе кіраваць працэсамі аздараўлення сацыяльна-эканамічнай абстаноўкі ў рэспубліцы, вобласці, горадзе і раёне, кожным канкрэтным населеным пункце.

Вялікія надзеі мы звязваем таксама з пераходам рэспублікі на новыя ўмовы гаспадарання, у аснову якіх пакладзены прынцыпы самакіравання і самафінансавання. Эканамічная самастойнасць Беларусі прадугледжвае, у прыватнасці, што ў веданне мясцовых Саветаў перадаюцца ўсе прадпрыемствы і арганізацыі, занятыя задавальненнем патрэб насельніцтва. Органы народнай улады атрымліваюць правы самастойна планаваць работу гэтай гаспадаркі, распараджацца заробленымі сродкамі, у тым ліку часткай прыбытку прадпрыемстваў вышэйшага падпарадкавання. Іншымі словамі, фарміраваць свой бюджэт і кантраляваць яго выкананне. Прадугледжаны і многія іншыя меры, накіраваныя на расшырэнне паўнамоцтваў мясцовых Саветаў.

**— Мікалай Іванавіч, сёй-той лічыць, што наш беларускі варыянт эканамічнай самастойнасці недастаткова радыкальны і таму не можа даць адчувальнага эфекту. Якая Ваша думка наконт гэтага?**

— Я хачу падкрэсліць, што размова ў даным выпадку ідзе толькі аб першачарговых мерах у гэтым напрамку на 1990 год, аб чым ясна сказана і ў адпаведнай пастанове Савета Міністраў БССР. Гэта значыць, што робяцца толькі першыя крокі і што працэс гэты будзе пастаянна развівацца і паглыбляцца ў трынаццатай пяцігодцы.

І, вядома, мы будзем настойліва і паслядоўна працягваць пачатую лінію на рашучую адмову ад каманднa - адміністрацыйных метадаў кіравання народнай гаспадаркай, замяняць іх эканамічнымі, цвёрда весці курс на ўсямернае развіццё рыначных адносін, на барацьбу з манапалізмам міністэрстваў і ведамстваў, на развіццё здаровай канкурэнцыі не толькі ў сферы матэрыяльнай вытворчасці, але і ў грамадска-палітычным жыцці.

Але вы, вядома, разумееце, што ўвасобіць у жыццё гэтыя добрыя намеры далёка не проста. Не ўсё пакуль робіцца так, як хацелася б, як таго чакаюць ад нас людзі. Перашкаджаюць існуючыя стэрэатыпы, дае аб сабе знаць мінулае, замінае адсутнасць адпрацаванай практыкі.

**— У выніку цяперашніх выбараў органы ўлады ў рэспубліцы рэзка абновяцца, істотна зменяцца і іх функцыі. Якімі якасцямі, на Вашу думку, павінны валодаць выбраннікі народа і да якога роду дзейнасці яны павінны быць гатовы?**

— Што датычыць Вярхоўнага Савета рэспублікі, то ў цэнтры яго клопатаў стане заканатворчая дзейнасць. Трэба будзе сфарміраваць новы ўрад, распрацаваць і прыняць новую Канстытуцыю БССР, вялікую колькасць эканамічных, палітычных, сацыяльных законаў. А гэта велізарная, карпатлівая работа. Калі гаварыць аб мясцовых Саветах, то яны, атрымаўшы неабходныя правы, фінансавыя і матэрыяльныя рэсурсы, павінны ўзяць на сябе і ўсю паўнату адказнасці за эканамічнае і сацыяльнае развіццё сваіх тэрыторый.

Задачы, якія неабходна вырашаць, і вызначаюць якасці будучых дэпутатаў. Гэта, несумненна, павінны быць людзі кампетэнтныя, сумленныя, прынцыповыя, якія шчыра перажываюць за інтарэсы сваіх выбаршчыкаў. І, вядома ж, дэпутат павінен быць чалавекам актыўным, які па-новаму мысліць, здольны на справе выконваць свае высокія абавязкі.

**— Падрыхтоўка да выбараў паказала высокую палітычную актыўнасць жыхароў нашай рэспублікі. На поўны голас заявілі аб сабе шматлікія новыя грамадскія фарміраванні. Выстаўляюцца рознага роду платформы, праграмы, звычайнай з'явай сталі мітынгі, шэсці. Як Вы да гэтага ставіцеся?**

— Тыя працэсы, якія адбываюцца сёння ў грамадстве, аб'ектыўна вынікаюць з палітыкі дэмакратызацыі і галоснасці, адкрытасці, праводзімай у краіне. Заканамернае пры гэ-

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы